Рэвалюцыя міравая, *Марлен* – Маркс і Ленін, *Кім* – Камуністычны інтэрнацыянал моладзі і інш.

Пафас – уласцівасць дыскурсіўная. Ідэалагізацыя слова непазбежна звязана з яго дыскурсіўнай трансфармацыяй. У жыцці адбываюцца знакавыя падзеі – карэнныя грамадскія пераўтварэнні. У розныя перыяды гісторыі ў рознай ступені жыццё непазбежна падвяргаецца ідэалагізацыі, што не можа не адлюстравацца ў мове. Ідэалагізацыя слова адбываецца па меры ідэалагізацыі жыцця. У часы рэвалюцыйных пераўтварэнняў антытэза "паэт і грамадзянін" губляе выразныя контуры. Паэт займае актыўную грамадзянскую пазіцыю, становіцца трыбунам, і яго творы набываюць пафаснае гучанне. Так, заклікам да барацьбы з ворагам гучаць радкі верша Янкі Купалы "Беларускім партызанам!": *Партызаны, партызаны, Беларускія сыны! За няволю, за кайданы Рэжце гітлерцаў паганых, Каб не ўскрэслі век яны.* Даследаванне маўленчага пафасу знаходзіцца ў рэчышчы фундаментальнай праблемы сувязі мовы і ідэалогіі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Бенвенист, Э. Общая лингвистика / Э. Бенвенист. – М.: Прогресс, 1974.
2. Виноградов, В. В. Русский язык. Грамматическое учение о слове /В. В. Виноградов. – 3-е изд. – М.: Высш. шк., 1986.
3. Флоренский, П. Имена / П. Флоренский Малое собрание сочинений. – Т. 1. – Москва: Купина, 1993.
4. Bauman, Z. Tożsamość. Rozmowy z Benedetto Vecchim / Z. Bauman. – Gdańsk: GW, 2007.
5. Castaneda, H. P. Identity and sameness / H. P Castaneda // Philosophia, vol.5, 1975, № 1–2.
6. Czyżewski, M. Dyskursy tożsamościowe w nauce i życiu społecznym: odmiany, własności, funkcje // Tożsamość, nowoczesność, stereotypy. – Kraków: NOMOS, 2012.

**Сянкевіч М.І.**
*(Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»)*

## МЕТОДЫКА ПРАЦЫ З ФАЛЬКЛОРНЫМІ ТВОРАМІ «МАЛОГА ЖАНРУ» Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

Вусная народная творчасць на працягу многіх стагоддзяў была своеасаблівым падручнікам жыцця, з дапамогай якога перадаваліся ад старэйшага пакалення да малодшага вопыт і веды, жыццёвая этыка і філасофія. Нікольки не паменшала яе роля і ў пару кампьютарных тэхналогій. Таму заканамерна, што складальнікі буквароў, чытанак, іншых

падручнікаў для пачатковай школы з увагай адносяцца да залацінак народнай мудрасці.

Усе выпадковасці чалавечага жыцця, усе добрыя і дрэнныя ўчынкі, усякае меркаванне беларусы падводзяць пад мерку ***прыказак,*** маленькіх шэдэўраў, поўных народнай мудрасці, лірызму, гумару. Шматлікія прыказкі ўхваляюць працавітасць, гаспадарлівасць, умельства, кемлівасць, вучаць любіць свой край і яго герояў. Яны бязлітасна асуджаюць гультайства, дармаедства, зайздрасць – усё заганнае, адмоўнае. Трапна выказваецца народ пра шчасце і долю, дабро і зло, праўду і крыўду.

Арганізуючы працу з малымі фальклорнымі жанрамі, у тым ліку і з прыказкамі, настаўнік пачатковых класаў сутыкаецца з тым, што іх вывучэнне не вылучана ў асобную тэму. Таму работа з такімі творамі павінна сістэматычна ўключацца педагогам у розныя этапы работы на ўроках мовы, літаратурнага чытання, азнаямлення з навакольным светам. У працы, у гульні, у штодзённых зносінах ёй таксама неабходна знайсці месца. Прыказкі, загадкі, жарты, скарагаворкі, заклічкі, народныя прыкметы, змешчаныя пасля мастацкіх твораў, абавязкова чытаюцца і аналізуюцца адначасова з апавяданнямі, вершамі, казкамі і байкамі. Настаўнік можа іх выкарыстаць ва ўступнай гутарцы, пры аналізе, пры асэнсаванні вобразнага зместу твора, а таксама на абагульняльных уроках па тэме і ў пазакласнай працы.

Пры рабоце з прыказкамі на ўроку літаратурнага чытання мэтазгодна выкарыстаць наступныя віды працы:

– тлумачэнне сэнсу прыказкі (гэтага не варта рабіць, калі прыказка ўжыта ў прамым сэнсе);

– знаходжанне ў тэксце сказаў, якія сталі прыказкамі;

– замена назва апавядання вядомай прыказкай;

– асэнсаванне вучнямі этымалогіі ўстарэлых слоў, што сустракаюцца ў фразеалагічных адзінках (“біць лынды”, “лахі пад пахі”, “збіць з панталыку” і інш.);

– падбор прыказак, якія адпавядаюць ідэйнаму зместу апавядання;

– уключэнне прыказкі ў прапанаваны тэкст на месцы “акенца”;

– узнаўленне прыказкі па апорных словах (адклад – лад; пагонішся – не зловіш; каса – камень; пасееш – пажнеш);

– узнаўленне прыказкі па малюнку (заўважана, што клас працуе больш ахвотна, калі малюнак нерэалістычны).

А вось на конт таго, ці могуць вучні пачатковых класаў самастойна скласці апавяданне па прыказцы (такія заданні яшчэ сустракаюцца на старонках падручнікаў па літаратурным чытанні), можна паспрачацца. Аб складанасці падобнай працы папярэджваў яшчэ Леў Талстой у вядомым артыкуле “Каму ў каго вучыцца пісаць – сялянскім дзецям у нас ці нам

у сялянскіх дзяцей”. Даючы сваім вучням заданне скласці апавяданне па прыказцы, вялікі пісьменнік і педагог не толькі прапанаваў прыкладны сюжэт будучага твора, але і сам напісаў першую старонку. І нават пасля гэтага з заданнем справілася ўсяго двое вучняў.

Несумненна, што ўсе прыказкі, прапанаваныя ў падручніку (іх, дарэчы, не так і шмат), карысна запамінаць. Гэтаму могуць паспрыяць конкурсы і віктарыны, якія добра праводзіць на абагульняльных уроках і ў пазаўрочны час. У іх карысна ўключыць наступныя конкурсныя заданні:

– хто больш назаве прыказак на зададзеную тэму;

–хто зможа прадоўжыць прымаўку па пачатку;

– хто больш назаве прыказак з канкрэтным назоўнікам (рука, галава, вочы ...), з лічэбнікам (“сем разоў адмер…”), з адмаўленнем у пачату (“не падмажаш…”, “не хваліся…”)

Прыказкі – незаменны матэрыял для хвілінак чыстапісання. Напрыклад, пры адпрацоўцы ўменя правільна пісаць літары Дд(дэ) можна выкарыстаць прыказкі “Добрая птушка сваё гняздо не паскудзіць”, “Давалі, ды з кішэні не вымалі” і іншыя.

Вывучэне граматыкі і правапісу таксама нельга ўявіць без працы з прыказкамі. Так, практыкавацца ў вызначэнні колькасці гукаў і літар у слове можна на матэрыяле прыказак, у якіх часта сустракаюцца літары, што служаць для абазначэння гукаў [дз] і [дж], а таксама тых, дзе мяккасць зычных перадаецца з дапамогай мяккага знака (“Зробіш людзям дабро і табе адгодзяць”, “ Між дзвярэй пальца не садзі”, “Мокры дажджу не баіцца”). А пры навучанні правапісу слоў з вялікай літары прыдатнымі будуць прыказкі, якія ўтрымліваюць імёны людзей і назвы населеных пунктаў (“Змяняў быка ў Мінску на індыка ў Пінску”, “Каму што, а Барыску ладкі”, “Язык і да Кіева давядзе”, “Ці цот ці лішка, ці Лявон ці Грышка”).

Дакладны выраз, поўны мудрасці і гумару, запамінаецца дзецьмі і ўздзейнічае на іх больш, чым павучанні і ўпрошванні. У малодшых школьнікаў фарміруецца густ да вобразнага, трапнага слова. Яны вучацца карыстацца ім у паўсядзённым жыцці. Значэнне іншасказальных, дакладных і вобразных народных прыказак раскрываецца перад дзіцём паступова. Глыбіня разумення іх залежыць ад таго, наколькі прадумана, метадычна выверана будзе весціся праца з гэтымі іскрынкамі народнага таленту на ўроках школьнага цыкла, у пазаўрочнай і пазашкольнай дзейнасці. Навучыць дзіця разуменню іншасказання, уменню “прыкласці” яго да сваіх учынкаў – вялікая педагагічная задача.

Дакладнасць, выразнасць і вобразнасць народнай мовы з асаблівай сілай праяўляецца ў ***загадках.*** У іх дзеці сустракаюць новыя для сябе

моўныя адзінкі, цікавыя метафарычныя выразы, якія асэнсоўваюць у працэсе адгадвання і далучаюць да свайго слоўнікавага запасу.

Карысным з’яўляецца і адваротнае практыкаванне: складанне загадак самімі дзецьмі, у ходзе якога мацнее сутворчасць вучняў і педагога. (Пра гэта мы падрабязна пісалі ў манаграфіі “Лінгваметадычныя і літаратуразнаўчыя асновы асэнсавання і аналізу мастацкага твора малодшымі школьнікамі”, Брэст, 2005. – С. 31–34). Скласці загадку можна падчас экскурсіі ў лес, у гарадскі парк, у поле. Настаўнік фіксуе ўвагу дзяцей на адным са знаёмых прадметаў ці на пэўнай прыроднай з’яве. Вылучаюцца найбольш вызначальныя рысы гэтага прадмета ці з’явы. Шукаецца, з чым іх можна параўнаць.

Прадуманая, нязмушаная праца па складанні загадак актыўна развівае ўяўленне дзяцей, вобразнае мысленне, памяць, мову. Завучванне і адгадванне загадак садзейнічае развіццю кемлівасці, знаходлівасці і лагічнага мыслення вучняў

У практыцы работы школы склалася пэўная сістэма правядзення практыкаванняў з ***скарагаворкамі:*** а) запаволенае, з падкрэсленай артыкуляцыяй вымаўленне; б) звычайны тэмп; в) паскораны тэмп). На нашу думку, у пачатковых класах над скарагаворкамі трэба працаваць як над “чыстагаворкамі”. Таму дастаткова абмежавацца толькі першымі двума этапамі. Галоўная задача заключаецца ў тым, каб навучыць дзяцей вымаўляць запісаны тэкст не хутка і не бегла, выразна і зразумела. Вымаўляць чыстагаворкі карысна розным па сіле голасам, на выдыху. Прывядзем толькі некаторыя ўзоры названага жанру.

*Лаўрэн лавіў на рэчцы рыбу, Ларыса варыла рыбу з лаўровым лістом.*

*У качкі качаня, у чаплі чапляня...*

*Звонка-звонка звініць званок, звініць заліваецца.*

*Жвавы вожык жыва жуку пашыў кажух.*

Вядома ж, у метадычнай скарбонцы кожнага настаўніка павінен быць дастаткова аб’ёмны запас чыстагаворак на кожны гук, як зычны, так і галосны. Выкарыстоўваць іх зручней за ўсё на ўроках роднай мовы ў якасці арфаэпічнай размінкі ў пачатку ўрока. Карысна, калі яна будзе спалучацца з хвілінкай чыстапісання, правядзенне якой паводле існуючых праграм з’яўляецца абавязковым.

На старонках чытанак для пачатковай школы змешчаны таксама народныя ***жарты.*** Іншы раз яны пададзены ў форме дыялога, што дае выдатную магчымасць для інсцэніроўкі такіх “смяшынак” непасрэдна на ўроку. Вясёлыя дыялогі можна паспяхова задзейнічаць таксама падчас правядзення пазакласных мерапрыемстваў. Напрыклад, наступныя не будзе складана разыграць на сцэне ўсяго пасля некалькіх рэпетыцый.